Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

1 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №102 (28466)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Знайсці сябра ў любым узросце
СТАР. 4



Нясумныя канікулы
СТАР. 8



Паўтарыў лёс многіх «звяздоўцаў»
СТАР. 11

# БУДУЧЫНЯ ЕЎРОПЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Двухгадовыя палачанкі Дар'я ШАКАВА і Ева САРАЧЫНСКАЯ каля знака «Цэнтр Еўропы», які ўстаноўлены ў самым старажытным горадзе Беларусі.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Васіль ЖАРКО, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Трэба думаць пра здароўе нашага будучага пакалення. Як педыятр кажу: вучань малодшых класаў павінен спаць мінімум 10 гадзін, сярэдніх — 9, старшых — 8 гадзін. У колькі нашы дзеці кладуцца? У колькі нашы ўнукі кладуцца? У колькі мы можам іх пакласці? Калі дзіця прыходзіць не выспаўшыся, а яшчэ заняткі паставілі адразу складаныя, ідзе хваляванне, стрэс, веды не засвойваюцца. Пік найлепшага засваення школьнай праграмы прыпадае на 10.30—14.00».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8673 | ▲ |
| Еўра | 2,0881 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0709 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Жамчужыны Беларусі

## ПАЛАЦ ШУКАЕ СПОНСАРА



**Рэканструкцыя аднаго з найпрыгажэйшых гісторыка-культурных помнікаў Беларусі можа расцягнуцца на дзесяцігоддзі**

**Знаўцы параўноўваюць Жыліцкі палацава-паркавы комплекс з Гомельскім, а некаторыя наогул ставяць яго ў шэраг з Мірскім і Нясвіжскім замкамі. Дарэчы, пры апошніх гаспадарах з роду Булгакаў ён па сваёй замкнёнай форме сапраўды нагадваў замак. Будынку пашчасціла. Ён ніколі не пуставаў. Пасля рэвалюцыі тут была школа для працоўнай моладзі, потым доўгі час размяшчаліся сельскагаспадарчыя ўстановы, цяпер аб'ект цалкам належыць культуры. Вялікі палац плошчай каля трох тысяч квадратных метраў з 2009 года знаходзіцца на рэканструкцыі. Планавалася, што ў 2018 годзе тут ужо можна будзе праводзіць балі ў традыцыях XIX стагоддзя. Але, на жаль, тэрміны рэканструкцыі зацягваюцца. Сёння цалкам зроблены толькі першая і напалову другая чэргі аб'екта. А іх усяго чатыры. Грошай на сённяшні дзень не хапае. Каб паскорыць працэс аднаўлення і прыцягнуць увагу спонсараў да ўнікальнага аб'екта, Нацыянальная акадэмія навук нядаўна правяла на яго базе рэспубліканскі семінар «Жылічы на гісторыка-культурнай карце Беларусі».**

СТАР. 5

■ Год навукі

## Пчолы адпачываюць...

### Як з'яўляюцца новыя сарты груш і яблынь

**Калі на цвіценне знаходзішся ў садах Інстытута пладаводства Нацыянальнай акадэміі навук, адчуванне, быццам у казку трапіў. Тут вы сустрэнеце яблыні не толькі ў беласнежнай пене, але і з кветкамі розных адценняў ружовага і нават барвовага колеру. На асобных дрэвах — лісты незвычайнай формы: бываюць нават падобныя на кляновыя і чарэшневыя. Кажуць, і плады да сезона тут будуць на зайздрасць — асобныя грушы і яблыкі хоць у касках збірай — важаць па 600-800 грамаў. У самым росквіце мы заспелі грушы і разам з вучонымі паўдзельнічалі ў апыленні. Наіўныя, мы спадзяваліся, што з тых кветачак, куды карэспандэнты «Звязды» нанясуць пылок, можа атрымацца насенне, якое з цягам часу выстраліць «новым сортам», і на чарговы юбілей газеты можна будзе палюбавацца на цудоўныя плады. Аказалася, што не так проста нешта стварыць. Гэта ўнікальныя выпадкі, калі скрыжоўванне адразу дае новы сорт яблыкаў ці груш. Часцей з соцень і нават тысячы сеянцаў атрымліваюцца асобныя ўдалыя экзэмпляры.**

СТАР. 9

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на ІІІ квартал і ІІ паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!